• Кніжныя рарытэты, фотаальбомы, даведнікі ў ілюстрацыях, турыстычныя буклеты прадставілі ў Нацыянальнай бібліятэцы на выстаўцы «Жамчужыны беларускай прыроды» да Сусветнага дня запаведнікаў і нацыянальных паркаў, паведамляе БелТА. Экспазіцыя складаецца з 9 тэматычных раздзелаў: «Прыродныя тэрыторыі Беларусі пад аховай», «Нацыянальныя паркі Беларусі. Белавежская пушча», «Па запаведных мясцінах. Бярэзінскі біясферны запаведнік» і іншых. Між тым прадстаўлены сапраўдны рарытэт — трэці том выдання «Жывапісная Расія», які выйшаў у 1882 годзе. Тут размешчаны артыкулы, напісаныя спецыяльна для гэтага выдання гісторыкам і этнографам А. Кіркорам на аснове матэрыялаў, сабраных ім у экспедыцыях у 1840—1850-я гады. Да ліку ўнікальных экспанатаў адносяць выданне «Белавежская пушча» (1894), якое мае арыгінальны падзагаловак «Накіды пяром і фатаграфіяй». Кніга змяшчае артыкул пра Белавежскую пушчу і 40 фатаграфій Вішнякова з маляўнічымі краявідамі самага старажытнага запаведніка Еўропы. Работа экспазіцыі прадоўжыцца да 5 чэрвеня.